*С.А. ВАЖНІК*

## РАЗВІЦЦЁ СІНТАКСІЧНАЙ ТЭОРЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІНГВІСТЫЦЫ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Рассматриваются процессы становления и развития белорусской синтаксической науки. При этом выдержан хронологический принцип подачи материала: проведены подсчеты синтаксических работ разных научных и учебно-методических жанров: диссертаций, монографий, академических грамматик, синтаксических словарей, учебников. Отдельно проанализированы работы, в которых исследуются разные синтаксические объекты – общие вопросы синтаксической теории, словосочетание, простое предложение, сложное предложение, вопросы пунктуации. Описаны синтаксические исследования, проведенные в области формального, исторического, семантического, функционального, сопоставительного, стилистического, ареального, культурологического и экспрессивного синтаксиса, а также в области других аспектов.

The article deals with the processes of formation and development of the Belarusian science syntax. At the same time maintained the principle of chronological presentation of the material: conducted counts of syntactic work of various research and teaching genres of dissertations, monographs, academic, grammar, syntax dictionaries, textbooks. Separately analyzed the studies in which different syntactic objects are investigated – general syntactic theory, the phrase, simple sentence, compound sentence, text, the questions of punctuation. Describes the research conducted in formal syntax, historical syntax, semantic syntax, functional syntax, comparative syntax, stylistic syntax, areal syntax, cultural syntax and expressive syntax as well as in other aspects.

У артыкуле разглядаюцца працэсы станаўлення і развіцця беларускай сінтаксічнай навукі. Пры гэтым вытрыманы храналагічны прынцып падачы матэрыялу:

па-першае, праведзены падлікі сінтаксічных прац, што адносяцца да розных навуковых і вучэбна-метадычных жанраў: *дысертацыі, манаграфічныя даследаванні, акадэмічныя граматыкі, сінтаксічныя слоўнікі, падручнікі і дапаможнікі для студэнтаў, настаўнікаў і школьнікаў* (табл. 1);

Табліца 1

**Працы па сінтаксісе беларускай мовы**

| Гады (усяго прац) | Дысертацыі: докт./канд. | Манаграфіі | Акадэмічныя граматыкі/ энцыклапедыі | Сінтаксічныя слоўнікі | Падручнікі/ дапаможнікі для ВНУ/настаўнікаў (з іх – па пунктуацыі) | Падручнікі/ дапаможнікі для школьнікаў (з іх – па пунктуацыі) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1910-я (3) | – | 1 | – | – | – | 2 |
| 1920-я (4) | – | – | – | – | 2 | 2 |
| 1930-я (7) | – | – | – | – | 4 | 3 |
| 1940-я (4) | 1/– | 2 | – | – | – | 1 |
| 1950-я (17) | –/7 | – | – | – | 7 (1) | 3 |
| 1960-я (23) | 1/12 | 3 | 1 | 1 | 5 (2) | – |
| 1970-я (41) | 4/15 | 13 | – | – | 8 (3) | 1 |
| 1980-я (33) | 2/4 | 8 | 1 | – | 17 (2) | 1 |
| 1990-я (54) | 6/6 | 13 | 1 | 2 | 21 (4) | 5 |
| 2000-я (80) | 2/13 | 9 | 1 | 3 | 33 (2) | 19 (10) |
| Усяго | 16/57 | 50 | 4 | 6 | 97 (14) | 37 (10) |
| | 267 | | | | | |

па-другое, прыведзены колькасныя дадзеныя прац, у якіх разглядаюцца розныя аб'екты сінтаксічнага апісання – *агульныя пытанні сінтаксічнай тэорыі, словазлучэнне, просты сказ, просты ўскладнены сказ, складаны сказ, ССЦ (ЗФА), тэкст, пытанні пунктуацыі* (табл. 2);

Табліца 2

**Аб'екты сінтаксічных даследаванняў у беларускім сінтаксісе**

| Гады (усяго прац) | Тэорыя сінтаксісу/агульныя пытанні | Словазлучэнне | Просты сказ | Просты ўскладнены сказ | Складаны сказ | ССЦ (ЗФА)/тэкст | Пунктуацыя |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1910-я (3) | 3 | – | – | – | – | – | – |
| 1920-я (4) | 4 | – | – | – | – | – | – |
| 1930-я (7) | 7 | – | – | – | – | – | – |
| 1940-я (4) | 1 | – | 3 | – | – | – | – |
| 1950-я (17) | 9 | 3 | 2 | – | 2 | – | 1 |
| 1960-я (23) | 4 | 8 | 4 | 2 | 3 | – | 2 |
| 1970-я (41) | 7 | 12 | 8 | 5 | 4 | 2 | 3 |
| 1980-я (33) | 16 | 7 | 4 | | 2 | 2 | 2 |
| 1990-я (54) | 32 | 6 | 6 | 1 | 1 | 4 | 4 |
| 2000-я (80) | 34 | 8 | 12 | | 6 | 8 | 12 |
| Усяго 267 | 117 | 44 | 40 | 7 | 19 | 16 | 24 |

па-трэцяе, прыведзены лічбы даследаванняў, выкананых у рэчышчы розных аспектаў сінтаксісу – *фармальнага, гістарычнага, семантычнага, функцыянальнага, супастаўляльнага, стылістычнага (арталагічнага), арэальнага, культуралагічнага, экспрэсіўнага і лінгваметадычнага* (табл. 3).

Табліца 3

**Аспекты сінтаксісу, распрацаваныя ў беларускай сінтакталогіі**

| Гады (усяго прац) | Сінтаксіс | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Фармальны | Гістарычны | Семантычны | Функцыянальны | Супастаўляльны | Стылістычны (арталагічны) | Арэальны | Культуралагічны | Экспрэсіўны | Лінгваметадычны |
| 1910-я (3) | 2 | 1 | – | – | – | – | – | – | – | – |
| 1920-я (4) | 3 | – | 1 | – | – | – | – | – | – | – |
| 1930-я (7) | 7 | – | – | – | – | – | – | – | – | – |
| 1940-я (4) | 1 | 3 | – | – | – | – | – | – | – | – |
| 1950-я (17) | 13 | 2 | – | – | 1 | 1 | – | – | – | – |
| 1960-я (23) | 18 | 4 | – | – | – | 1 | – | – | – | – |
| 1970-я (41) | 29 | 4 | 2 | 2 | 2 | – | 1 | – | – | 1 |
| 1980-я (33) | 18 | 1 | – | 1 | 4 | 4 | 1 | – | – | 4 |
| 1990-я (54) | 27 | – | – | 4 | 9 | 3 | 5 | 6 | – | – |
| 2000-я (80) | 61 | 1 | 3 | 2 | 3 | 3 | 2 | 1 | 1 | 3 |
| Усяго 267 | 181 | 16 | 6 | 9 | 18 | 12 | 9 | 7 | 1 | 8 |

Дадзеныя атрыманы паводле бібліяграфічнага паказальніка «Беларускае мовазнаўства» (Мн., 1967, 1980, 1993, 2004), прац Л. Шакуна (гл. Шакун 1995), А. Жураўскага, А. Крывіцкага (гл. Жураўскі, Крывіцкі 1979), М. Яленскага (гл. Яленскі 1989), Г. Клюсава (гл. Клюсаў 1993) і М. Канюшкевіч (гл. Конюшкевич 2010), а таксама каталога Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Усяго былі эксплікаваны 267 прац, прысвечаныя сінтаксісу беларускай мовы.

**Пачаткі беларускай сінтаксічнай навукі** адносяцца да **1910-х гг.**, калі распачаліся сістэмныя, а галоўнае – сістэматычныя даследаванні беларускага сінтаксісу, і звязаны з манаграфічным па сваёй сутнасці параўнальна-гістарычным даследаваннем Я.Ф. Карскага (гл. Карский 2006), а таксама падручнікамі для школы Б. Тарашкевіча (гл. Тарашкевіч 1918/1929) і Б. Пачобкі (гл. Пачобка 1918).

Першым фундаментальным апісаннем беларускага сінтаксісу (сінтаксісу беларускіх народных гаворак і сінтаксісу старабеларускага пісьменства) па праву лічацца «Нарысы сінтаксісу беларускай мовы» Я.Ф. Карскага. Першая глава «Нарысаў» – «Просты сказ» – тэарэтычная: Я.Ф. Карскі раскрывае тут базавыя паняцці тагачаснай сінтаксічнай тэорыі: паняцці сінтаксісу, мовы і маўлення, сказа, дзейніка і выказніка, простага і складанага сказаў. Сінтаксіс простага сказа ў інтэрпрэтацыі Я.Ф. Карскага відавочна фармальны. Другая глава мае практычны характар: тут даследчык прыводзіць канкрэтныя тыпы ўласцівых беларускай мове двух- і аднасастаўных канструкцый, падрабязна разглядае спосабы выражэння ў беларускай мове галоўных і даданых членаў сказа, структурныя тыпы выказніка, звяртае ўвагу на асаблівасці ўжывання асноўных граматычных катэгорый імя ў функцыі дзейніка і дзеяслова ў функцыі выказніка. Пры класіфікацыі складаных сказаў канцэпцыя вучонага выдзяляецца сваёй арыгінальнасцю. На першай ступені падзелу даследчык вылучае два асноўныя віды сінтаксічнай сувязі, што маюць месца ў складаных сказах: *паратаксіс*, або злучэнне сказаў *раўнапраўных*, і *гіпатаксіс*, або спалучэнне сказаў *нераўнапраўных*. Такі падыход дазваляе лічыць Я.Ф. Карскага пачынальнікам так званага *семантычнага падыходу* (падыходу *«ад плана зместу – да плана выражэння»*) пры класіфікацыі складаных сказаў. У сучаснай версіі *семантычнага падыходу* прытрымліваецца А.Я. Міхневіч, падзяляючы складаныя сказы на першай ступені падзелу (паводле асноўнай сінтаксічнай сувязі) на (1) *складаназлучаныя* і (2) *складаназалежныя*, а на другой ступені падзелу (паводле наяўнасці/адсутнасці сродкаў сувязі) кожны з гэтых тыпаў – на *злучнікавыя* і *бяззлучнікавыя*. Сінтаксічная канцэпцыя Я.Ф. Карскага не страціла сваёй актуальнасці і сёння, прычым не толькі ў практычным плане (як помнік граматычнай думкі беларусаў пэўнага перыяду), але, што самае галоўнае, і ў тэарэтычным плане: заслуга Карскага ў тым, што ў сваіх «Беларусах» ён заклаў **тэарэтыка-метадалагічныя асновы беларускага сінтаксісу**.

У «Беларускай граматыцы для школ» Б. Тарашкевіча прадстаўлена самае сціслае сістэмнае апісанне асноў сінтаксісу беларускай мовы. Патрэбы школы прымусілі аўтара адысці ад уласна навуковага падыходу і прытрымлівацца практычнага. Тым не менш «мінімальны» аб'ём і практычны пачатак сінтаксічнай часткі не перашкодзіў Б. Тарашкевічу закласці ў сваёй працы фундамент беларускай сінтаксічнай тэрміналогіі. Так, ужо ў «Першым коле» разглядаюцца базавыя пытанні беларускага сінтаксісу, цэнтральным з якіх з'яўляецца паняцце *сказа*. Параўн.: *§ 33 Сказ; § 34 Сказы абвяшчальныя, пытальныя, клічныя; § 35* Дзейнік і выказьнік; § 35 Асноўныя і даданыя часьціны сказу; § 36 Азначэньне; § 37 Дапаўненьне; § 38 Акалічнасьці (акалічнасьці часу, месца, прычыны, спосабу і мэты); § 39 Віды сказаў (зьлітыя, разьвітыя, неразьвітыя); § 40 Просты і зложаны сказ* (Тарашкевіч 1929, 37–45). У раздзеле «Сказ» («Другое кола») Б. Тарашкевіч пашырае тэарэтычны матэрыял. Параўн.: *§ 99 Прыдатак; § 100 Пабочнае слова; § 101 Зваротак або клічнае слова; § 102 Залежныя сказы (сказы дзейніка, сказы выказьніка, сказы дапаўненьня, сказы азначэньня, сказы акалічнасьці месца, сказы акалічнасьці часу, сказы акалічнасьці спосабу, сказы акалічнасьці мэты, сказы акалічнасьці прычыны, сказы ўмоўныя, сказы ўступальныя); § 103 Пабочныя сказы; § 104 Скарочаныя даданыя сказы; § 105 Зложана-залежны і зложана-злучаны сказ.* У параграфе «Знакі прыпынку» Тарашкевічам закладзены тэарэтычны падмурак навуковага апісання пунктуацыйных норм БЛМ. У першых выданнях «Беларускай граматыкі», пачынаючы з 1918 г., у спецыяльным параграфе «Знакі прыпынку» разглядаліся асноўныя знакі прыпынку беларускай мовы (*пункт 'кропка', коска, пункт з коскай 'кропка з коскай', два пункты 'двукроп'е', працяжнік, недаказ* або *многакроп'е 'шматкроп'е', чужаслоў 'двукоссе', скобкі, пытальнік, клічнік*), указвалася іх сінтаксічная функцыя і прыводзіліся агульныя прынцыпы пастаноўкі іх у тэксце (гл. Тарашкевіч 1929, 128–132). У пятым выданні (1929 г.) былі зроблены частковыя змены. Параўн.: *пункт, коска, пункт з коскай* або *пасрэднік, два пункты, працяжнік, недаказ* або *многакроп'е, чужаслоў, дужкі, пытальнік, клічнік.* Традыцыйны тэрмін *кропка* замацоўваецца ў школьных граматыках у 1920-я гг., але яшчэ не знікаюць *недаказ* і *чужаслоў*.

Першапачаткова *назвы знакаў прыпынку* ў беларускай мове мелі **нацыянальны характар**. Так, у кнізе К. Каганца «Беларускі лемэнтар, або Першая навука чытання» (гл. Каганец 1906) знакі прыпынку называліся: *кропка, закавыка, кропка з закавыкай, двукропе, працяжка, пытаннік, клічнік, недаказ, чужаслоў* (назва дужак адсутнічае). Сістэма знакаў прыпынку ў працах Я. Лёсіка больш набліжаная да сучаснай (у параўнанні з «Граматыкай» Б. Тарашкевіча): разглядаюцца правілы ўжывання наступных знакаў прыпынку: *коска, двукроп'е, працяжнік, злучок, двукосьсе, дужкі, клічнік, пытальнік, трохкроп'е (шматкроп'е), кропка з коскай, пункт (кропка).* Толькі ў 1937 г. «Руска-беларускі слоўнік» канчаткова замацоўвае сучасныя тэрміны *кропка, коска, кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік, пытальнік, клічнік, шматкроп'е, дужкі, двукоссе* (Клюсаў 1993, 10), якія без змен захаваліся ў праграмах і падручніках па сучаснай беларускай мове да сённяшняга часу.

Паводле Л.М. Шакуна, Б. Тарашкевіч меў праграму па падрыхтоўцы падручнікаў і дапаможнікаў па беларускай мове: у якасці другой і трэцяй частак «Беларускай граматыкі для школ» меркавалася выданне сінтаксісу і гістарычнай граматыкі. Аднак «Сінтаксіс беларускай мовы», здадзены Тарашкевічам у друк у 1923 г., па невядомых прычынах не выйшаў (гл. Шакун 1995, 127).

«Граматыка беларускай мовы» Б. Пачобкі, напісаная лацінкай, распачынаецца раздзелам «Сказ і яго часці», у якім разглядаюцца *кароткія* і *развітыя сказы, абсуд (‘дзейнік’), прысуд (‘выказнік’), сказ безабсудны* і *безпрысудны, няпоўныя, развітыя, злітныя сказы.* Варта адзначыць, што ў «Граматыцы» прыводзіцца толькі тэорыя, у асобных выпадках да правілаў падаюцца прыклады.

**1920-я гг.** Сінтаксіс у гэты час «вывучаўся ў меру патрабаванняў школьнага выкладання» (Шакун 1995, 177), а таму асноўная ўвага была скіравана на стварэнне падручнікаў для школы і самаадукацыі: працы Я. Лёсіка (гл. Лёсік 1926), А. Багдановіча (гл. Багдановіч 1927), І. Пратасевіча, І. Самковіча (гл. Пратасевіч, Самковіч 1928, 1929), напісаныя ў асноўным у рэчышчы *фармальнага сінтаксісу*. «Сынтакс» Я. Лёсіка – хутчэй выключэнне з правіла. У кантэксце здабыткаў сучаснай беларускай сінтаксічнай навукі, фармальнай па сваёй сутнасці, *вербацэнтрычная канцэпцыя сказа*, прадстаўленая ў Я. Лёсіка (гл. Лёсік 1926), гучыць надзвычай «рэвалюцыйна». Параўн.: «Граматычнае злучэньне з асабовым дзеясловам або з такім словам, што падмяняе асабовы дзеяслоў, называецца сказам… Асноўнае значэньне ў сказе маюць словы не называльныя, а выказальныя… Такім выказальным словам звычайна бывае дзеяслоў у васабовай форме. Мы бачылі, што якраз дзеяслоў і абарачае моўнае злучэньне слоў у сказ» (Лёсік 1926, 16, 18). Адкуль жа «дзеяслоўны» акцэнт у сінтаксічнай канцэпцыі Я. Лёсіка? Гэта становіцца зразумелым, калі ўлічыць, што свой «Сынтакс» Я. Лёсік пісаў, арыентуючыся на «лепшыя падручнікі расійскіх граматыстаў» (працы Д.І. Аўсяніка-Кулікоўскага, А.В. Ветухава, А.В. Міртава, А.М. Пяшкоўскага, П.Н. Сакуліна і інш.), многія з якіх з’яўляліся вучнямі А.А. Патабні. Нагадаем, што якраз апошні, абапіраючыся на ідэі В. Гумбальта і Г. Штэйнталя, стварыў своеасаблівую «філасофію дзеяслоўнасці» і першым пачаў выказваць *ідэі вербацэнтрычнасці сказа* – на стагоддзе раней за з’яўленне «Асноў структурнага сінтаксісу» Л. Тэньера. Такім чынам, *ідэі вербацэнтрычнасці сказа* і ў беларускім мовазнаўстве пачалі сцвярджацца значна раней за еўрапейскую сінтаксічную навуку.

**1930-я гг.** можна адносіць да пачатковага этапу развіцця беларускага сінтаксісу: працягваецца традыцыя стварэння падручнікаў і дапаможнікаў па беларускай мове, у якіх апісваюцца агульныя асаблівасці сінтаксісу беларускай мовы. У адзначаны перыяд напісана сем такіх прац, большая частка якіх мае профільны характар (гл. Чудовіч, Дружылоўская 1930; Пратасевіч, Самковіч 1931, 1933; Саломенік, Шэўчык 1934; Лычкоўскі, Зенько 1935, 1935 [а]). Назва адной з іх – «Фармальны сінтаксіс» (гл. Чудовіч, Дружылоўская 1930) – сведчыць пра традыцыйны характар апісання адпаведнага аспекту беларускага сінтаксісу яшчэ ў 1930-я гг. Адзначым таксама з’яўленне ў 1939 г. **першага падручніка для ВНУ** «Сінтаксіс беларускай мовы» К.І. Гурскага, Ц.П. Ломцева, С.Л. Рохкінда, С.І. Рысінай, Г.З. Шкляра (гл. Сінтаксіс 1939). «Сінтаксіс-1939» напісаны ў лепшых традыцыях здабыткаў рускай сінтаксічнай навукі, бо, як адзначае В. Барысенка ў прадмове да працы, «аўтары не мелі перад сабой узора падобнага падручніка, таксама як і не мелі патрэбных навуковых даследванняў у галіне беларускага сінтаксісу. Для стварэння падручніка прыйшлося зрабіць некаторыя даследванні; аўтарамі таксама былі скарыстаны даныя рускіх сінтаксістаў Шахматава, Патэбні, Оўсяніка-Кулікоўскага і Пешкоўскага. Блізасць беларускай мовы з брацкай рускай мовай <…> дазволіла з поспехам скарыстаць важнейшыя дасягненні гэтых буйнейшых рускіх вучоных» (Сінтаксіс 1939, 3). Гэта лішні раз даказвае, што спецыяльных навуковых даследаванняў сінтаксісу беларускай мовы ў першай палове ХХ ст. не праводзілася. Нягледзячы на «русіфікаваны» характар пададзенай у падручніку тэорыі, аўтарамі ўпершыню ў шырокім аб’ёме была разгледжана *сістэма сінтаксічных адзінак беларускай мовы.* Такім чынам, толькі з канца 1930-х гг. пачынае адбывацца найбольш поўнае апісанне беларускага сінтаксісу.

**1940-я гг.** можна сімвалічна назваць «дзесяцігоддзем Ц.П. Ломцева», бо якраз дзякуючы намаганням пачынальніка рускага семантычнага сінтаксісу ў беларусістыцы распачынаецца навуковае апісанне асноў беларускага сінтаксісу. На гэты час прыходзіцца выхад у свет двух манаграфічных даследаванняў першага дэкана філфака БДУ: «Выражение главных членов предложения в белорусском языке» (гл. Ломтев 1940) і «Исследования в области истории белорусского синтаксиса. Составное сказуемое и его изменения в истории белорусского языка» (гл. Ломтев 1941), за якія ў 1944 г. вучонаму **ўпершыню** ў галіне беларускага мовазнаўства была прысуджана вучоная **ступень доктара філалагічных навук.** Працы Ц.П. Ломцева выкананы ў рэчышчы *гістарычнага сінтаксісу*.

**1950-я гг.** – пачатак шырокай цікавасці навукоўцаў да распрацоўкі сінтаксічнай тэорыі, пра што сведчыць **абарона першых сямі кандыдацкіх дысертацый па беларускім сінтаксісе**. У беларускай сінтакталогіі пачынае актыўна распрацоўвацца *тэорыя словазлучэння* (гл. Барковский 1954; Евневич 1956; Зеневич 1958). Не знікае цікавасць да *простага* (гл. Наркевич 1956) і *складанага сказаў* (гл. Гурский 1950; Бурак 1958). Паводле аспектаў даследавання дамінуюць *фармальна-сінтаксічныя* работы, прадстаўленыя ў асноўным падручнікамі і дапаможнікамі для школы і ВНУ (гл. Самцэвіч, Зомерфельд 1950; Ломтев 1951; Карзон, Жыркевіч 1955; Жыркевіч 1956; Ломтев 1956; Гурскі, Булахаў,

Марчанка 1958; Курс 1959). Не апошняе месца займаюць таксама работы ў рэчышчы *гістарычнага сінтаксісу* (гл. Булахов 1953; Лапов 1955). Адзначым таксама факт з'яўлення першых *супастаўляльных* (гл. Ломтев 1958) і *стылістычных* (гл. Цікоцкі 1958) прац.

З'яўляюцца і новыя падручнікі для ВНУ, у якіх сінтаксіс беларускай мовы не толькі *апісальны*, але і *тэарэтычны*. Так, у сінтаксічнай частцы акадэмічнага «Курса сучаснай беларускай літаратурнай мовы» М.Г. Булахава, Л.І. Бурака, Б.С. Лапава, А.І. Наркевіча, П.П. Шубы (гл. Курс 1959) прадстаўлены сістэмны падыход да апісання сінтаксічных з'яў, якія раней не вывучаліся, што дазволіла максімальна поўна, згодна з дасягненнямі сінтаксічнай навукі таго часу, апісаць сінтаксічную сістэму беларускай літаратурнай мовы. Пры гэтым зноў, як і ў папярэдніх падобных працах, пры напісанні ўлічаны «вопыт вядомых рускіх і ўкраінскіх моваведаў мінулага» (Ф.І. Буслаева, А.А. Патабні, Ф.Ф. Фартунатава, А.А. Шахматава, А.М. Пяшкоўскага, Д.М. Аўсяніка-Кулікоўскага і інш.), што пры недахопе спецыяльнай літаратуры вельмі важна для тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў. Сінтаксічная структура і фармальны пачатак «Курса» амаль цалкам былі перанесены ў акадэмічную «Граматыку беларускай мовы» (гл. Граматыка 1965), напісаную фактычна тымі ж самымі аўтарамі. Аўтарская спроба апісання сінтаксісу сучаснай беларускай мовы належыць і Ц.П. Ломцеву: маюцца на ўвазе рускамоўныя падручнікі Ц.П. Ломцева (гл. Ломтев 1951, 1956). У другой працы раздзел «Сінтаксіс» займае амаль 200 старонак, аднак вядомы сінтаксіст не вызначаецца тут арыгінальнасцю: падручнік напісаны ў рэчышчы *фармальнага падыходу*, да ўсяго аўтар зыходзіць з пазіцый рускай мовы.

У канцы 1950-х гг. адбываецца кадыфікацыя пунктуацыйных правілаў беларускай мовы (гл. Правілы 1959). Яны ў асноўным сфармуляваны ў рэчышчы рускай пунктуацыйнай традыцыі.

**1960-я гг.** знамянальныя абаронай **першай доктарскай дысертацыі па *сінтаксісе складанага сказа*** (гл. Груцо 1968) і 11 кандыдацкіх дысертацый (больш абароненых дысертацый (15) толькі ў 2000-я гг.), сем з якіх – па *сінтаксісе словазлучэння* (гл. Шидловский 1962; Михневич 1963; Жилунович 1966; Наумович 1966; Подгайский 1966; Астафьева 1968; Бондаренко 1969), тры – па *сінтаксісе простага сказа* (гл. Пивторак 1964; Гаврош 1969; Ковалев 1969), дзве – *па сінтаксісе складанага сказа* (гл. Кремко 1960; Борисоглебская 1961). Адзначым таксама з'яўленне ў беларускай сінтаксічнай навуцы ўласна *славістычнай дысертацыі* Б.Ю. Нормана «Зваротныя канструкцыі ў сучаснай балгарскай літаратурнай мове» (гл. Норман 1969).

Значнай падзеяй у гісторыі беларускага мовазнаўства можна лічыць выданне сінтаксічнага тома «Граматыкі беларускай мовы» (гл. Граматыка 1965), у якой закладзены тэарэтычныя асновы беларускага сінтаксісу, а таксама першага ўласна сінтаксічнага слоўніка (гл. Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967), аналагаў якому няма ў славістыцы. У слоўніку прадстаўлены агульныя прынцыпы дыстрыбуцыйнага аналізу словаўтваральных фармантаў пры ўліку актантнага акружэння дзеясловаў. Адзначаная праца вылучаецца і сваім арыгінальным падыходам да класіфікацыі дзеясловаў. Звяртаючыся да прынцыпаў семіятычнай сінтагматыкі, свабоднай ад граматычных абмежаванняў натуральных моў, аўтары вылучылі восем семантычных класаў дзеясловаў пры ўліку іх семантычных дыстрыбуцыйных уласцівасцей.

Манаграфічныя даследаванні, што з'явіліся ў названы перыяд, таксама вызначаюцца шырынёй праблематыкі: *фармальны сінтаксіс простага ўскладненага сказа* (гл. Базыленка 1964), *трансфармацыйная граматыка непадзельнага словазлучэння* (гл. Міхневіч 1965), *гістарычны сінтаксіс простага сказа* (гл. Борковский 1968). На гэтым фоне варта прыгадаць таксама ўласна славістычную манаграфію Г.А. Цыхуна (гл. Цыхун 1968), дзе разглядаюцца асаблівасці сінтаксісу займеннікавых клітык паўднёваславянскіх моў.

З'яўляюцца **«класічныя» падручнікі** па беларускім сінтаксісе: «Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы» М.С. Яўневіча, П.У. Сцяцко (гл. Яўневіч, Сцяцко 1969), «Практычная стылістыка беларускай мовы» М. Цікоцкага (гл. Цікоцкі 1965), а таксама дапаможнікі па пунктуацыі Л.І. Бурака, Г.Н. Клюсава і А.Л. Юрэвіча (гл. Клюсаў, Юрэвіч 1966; Бурак 1969).

**1970-я гг.** без перабольшвання – «залаты час» у гісторыі беларускай сінтаксічнай навукі. Уражваюць колькасныя паказальнікі: абарона 19 (!) «сінтаксічных» дысертацый (больш чым за ўсе іншыя перыяды): чатырох доктарскіх і 15 кандыдацкіх дысертацый; 13 манаграфій. У 1970-я гг. пашыраецца тэматыка сінтаксічных даследаванняў. У гэты перыяд праводзяцца фундаментальныя даследаванні, якія будуць прадвызначаць развіццё тэарэтычнай сінтаксічнай думкі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў: «Прыназоўнік у беларускай мове» П.П. Шубы (гл. Шуба 1971, 1971 [а]), «Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове» А.І. Наркевіча (гл. Наркевіч 1972; Наркевич 1973), «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» А.Я. Міхневіча (гл. Міхневіч 1976; Михневич 1976), «Далучэнне ў сучаснай беларускай літаратурнай мове» Л.І. Бурака (гл. Бурак 1979). Найбольш прац – 12 (найлепшы паказальнік за ўсе гады) – прысвечана распрацоўцы *тэорыі словазлучэння* (гл. Карповiч 1970; Прохорова 1970; Падгайскі 1971; Шуба 1971, 1971 [а]; Наркевіч 1972; Елисеева 1973; Наркевич 1973; Тарасевич 1973; Дюбайло 1975; Яўневіч 1977); 13 прац – па *сінтаксісе простага* і *простага ўскладненага сказаў* (гл. Авласевич 1970; Аўласевіч 1970; Курбыко 1971; Моложай 1971; Рабкевич

1973; Шумская 1973, 1976; Бурако 1974; Данильчик 1974; Бурак 1975, 1979; Гаўрош 1975; Роговцов 1978); чатыры – па *сінтаксісе складанага сказа* (гл. Груцо 1970; Крамко 1970; Борковский 1972–1973; Конюшкевич 1979). Асобна адзначым цікавасць вучоных да *ССЦ/ЗФА і тэксту* і з'яўленне першых прац, у якіх апісаны адпаведныя сінтаксічныя адзінкі (гл. Юрэвіч 1975; Лінгвістычны аналіз 1978). Пунктуацыя прадстаўлена працамі ўжо вядомых у навуцы сінтаксістамі (гл. Бурак 1970, 1976; Клюсаў, Юрэвіч 1972).

1970-я гг. вызначаюцца таксама шырынёй дыяпазону сінтаксічных даследаванняў у рэчышчы розных лінгвістычных аспектаў. Менавіта ў гэты перыяд з'яўляюцца **першыя** ў беларускім мовазнаўстве **працы па *семантычным* і *функцыянальным сінтаксісе* беларускай мовы** (гл. Михневич 1976; Міхневіч 1976; Шуба 1971, 1971 [а]), **па *лінгваметодыцы*** (гл. Супрун 1974) і ***арэальным сінтаксісе*** (гл. Прохорова 1970). Працягваецца вывучэнне беларускага сінтаксісу ў рэчышчы *гістарычнага* (гл. Груцо 1970; Крамко 1970; Борковский 1973; Елисеева 1973) і *супастаўляльнага* (гл. Кривицкий, Михневич, Подлужный 1973; Супрун 1974) аспектаў. Істотнае значэнне для беларускага сінтаксісу маюць працы Б.Ю. Нормана, прысвечаныя *граматычным катэгорыям* і *сінтаксічным уласцівасцям дзеяслова* (гл. Норман 1972), а таксама *сінтаксісу маўленчай дзейнасці* (гл. Норман 1978).

Фундаментальная манаграфія А.Я. Міхневіча «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» (гл. Міхневіч 1976) мае вялікае агульнатэарэтычнае значэнне і да сённяшняга часу лічыцца адной з найлепшых манаграфій па *семантычным сінтаксісе* ў славістыцы. У манаграфіі акрэсліваюцца найбольш істотныя праблемы і аспекты вывучэння граматычнага ладу беларускай мовы: узроўневая структура выказвання ў залежнасці ад ступені граматычнай абстракцыі; селекцыйныя катэгорыі, якія фарміруюць семантыка-сінтаксічныя класы слоў; спосабы выражэння селекцыйных значэнняў у беларускай мове; семантыка-сінтаксічная стратыфікацыя слоўніка як адзін з аспектаў «скрытай» граматыкі; семантыка-сінтаксічныя апазіцыі класаў слоў і інш.

Адмысловая аўтарская мадэль *семантычнага сінтаксісу* прадстаўлена ў працах В.У. Мартынава (гл. Мартынов 1974; Мартынов 1977), які зыходзіць з самых агульных семіятычных прынцыпаў: усе элементы моўнай сістэмы параджаюцца сінтаксічна і вызначаюцца праз сінтаксіс. Гэта значыць, што пачаткам любога даследавання мовы павінна быць вызначэнне пэўнай мінімальнай канструкцыі, у межах якой можа «праявіцца» тая ці іншая моўная адзінка. Такой канструкцыяй, на думку вучонага, з'яўляецца мінімальны (трохэлементны) сінтаксічны ланцужок (SPO), у якім прэдыкат вызначаецца як адзінка, што эксплікуе адносіны паміж суб'ектам (S) і аб'ектам (O) (гл. Мартынов 1977, 19). Ідэі вучонага знайшлі адлюстраванне і ў пазнейшых працах (гл. Мартынов 1982, 1984, 2001).

Пачаткі *функцыянальнага сінтаксісу* беларускай мовы звязваюцца са з'яўленнем у беларускім мовазнаўстве манаграфіі П.П. Шубы «Прыназоўнік у беларускай мове» (гл. Шуба 1971). У працы актыўна распрацоўваецца *функцыянальна-семантычны* падыход (падыход *«ад зместу/функцыі да формы»*), звязаны з апісаннем функцыянальнага значэння прыназоўнікаў. П.П. Шубам вылучана чатырнаццаць асноўных тыпаў і сорак шэсць падтыпаў семантыка-сінтаксічных адносін, якія выражаюцца ў сказе пры дапамозе прыназоўнікаў. Вынікі далейшага вывучэння функцый прыназоўнікаў знайшлі адлюстраванне ў першым томе «Беларускай граматыкі» (Мн., 1985), а таксама ў «Тлумачальным слоўніку беларускіх прыназоўнікаў» (гл. Шуба 1993). Ідэя палявой класіфікацыі прыназоўнікаў П.П. Шубы пакладзена ў аснову канцэпцыі міжнароднага навуковага праекта «Славянскія прыназоўнікі ў сінхраніі і дыяхраніі: марфалогія і сінтаксіс» (кіраўнік – праф. М.У. Всеваладава).

**1980-я гг.** перш за ўсё асацыіруюцца са з'яўленнем у беларускім мовазнаўстве другой акадэмічнай граматыкі беларускай мовы (гл. Беларуская граматыка 1986), якая адыграла вялікую ролю ў нармалізацыі беларускай літаратурнай мовы. Абаронены дзве доктарскія дысертацыі (па *сінтаксісе словазлучэння* (гл. Евневич 1981) і па *тэорыі і практыцы навучання сінтаксісу беларускай мовы ў сярэдняй школе* (гл. Протченко 1989)) і чатыры кандыдацкія дысертацыі (гл. Ратникова 1980; Лещенко 1982; Рачевский 1987; Зеленко 1989). Найбольш прац прадстаўлена па *агульнай сінтаксічнай тэорыі* (13) і па *сінтаксісе словазлучэння* (7), сярод якіх вылучаюцца даследаванні М.С. Яўневіча (гл. Евневич 1981) і Т.П. Бандарэнкі (гл. Бандарэнка 1981). Акрамя традыцыйных для беларускай сінтакталогіі прац *фармальна-сінтаксічнага характару*, у адзначаны перыяд актыўна распрацоўваюцца таксама і іншыя аспекты сінтаксічных даследаванняў: *гістарычны* (гл. Структура предложения 1983), *супастаўляльны* (гл. Борковский 1981; Шаранда 1981; Норман 1988; Анічэнка 1989; Конюшкевич 1989), *функцыянальны* (гл. Конюшкевич 1989), *стылістычны* (гл. Каўрус 1980, 1983; Юрэвіч 1983; Лепешаў 1989), *арэальны* (гл. Яшкін 1980), *лінгваметадычны* (гл. Протчанка 1984, 1987, 1989; Протченко 1989). Даследаванні ў галіне *семантычнага сінтаксісу* ў 80-я гг. працягвае М.І. Лешчанка (гл. Лещенко 1988, 1989). Праблемы *тыпалагічнага сінтаксісу* распрацоўваюцца Г.А. Цыхуном (гл. Цыхун 1981).

1980-я гг. – час стварэння **«класічных» падручнікаў**, да ліку якіх можна аднесці адразу некалькі крыніц: «Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя» Л.І. Бурака (Бурак 1987), дапаможнікі Л.І. Бурака *па пунктуацыі* (гл. Бурак 1980, 1982), дапаможнікі І.Я. Лепешава і Г.М. Малажай па *сінтаксісе тэксту* (гл. Лепешаў 1981; Малажай 1982).

У **1990-я гг.** большасць дысертацыйных даследаванняў прысвечана *супастаўляльнаму* апісанню беларускай і рускай моў, беларуска-рускім моўным кантактам і білінгвізму, узаемаўплыву беларускай і рускай моў на розных узроўнях і ў розных аспектах (гл. Гируцкий 1990, 1990 а; Конюшкевич 1990; Прохорова 1991; Мощенская 1992, 1992 а; Роўда 1996, 1999; Чумак 1997, 1997 [а]). Адзначым факт з'яўлення ў гэты час энцыклапедыі «Беларуская мова» (гл. Беларуская мова 1994), на старонках якой дастаткова вялікая колькасць артыкулаў прысвечана сінтаксічнай праблематыцы. Вылучым таксама з ліку іншых прац і два *сінтаксічныя слоўнікі*: традыцыйны *слоўнік спалучальнасці* (*слоўнік кіравання*) Г.У. Арашонкавай і В.П. Лемцюговай (гл. Арашонкава, Лемцюгова 1991) і спроба *функцыянальна-семантычнага* апісання беларускіх прыназоўнікаў П.П. Шубы (гл. Шуба 1993), аналагаў якой не было ў славістыцы ў адзначаны перыяд.

Традыцыйныя аб'екты даследавання – *словазлучэнне* (гл. Волочко 1990; Концевая 1991; Бондал 1995; Рагаўцоў 1999), *просты сказ* (гл. Бузук 1992; Рабчинская 1994; Рачэўскі 1994; Паўлоўская 1995; Рамза 1996, 1998; Михайлова 1998), *складаны сказ* (гл. Конюшкевич 1990), *пунктуацыя* (гл. Бурак, Бурак 1993; Клюсаў 1993). Значна больш увагі, у параўнанні з папярэднімі перыядамі, надаецца ў 1990-я гг. распрацоўцы агульнай тэорыі ССЦ/ЗФА і тэксту (гл. Малажай 1992; Супрун 1996; Маслова 1997, 1999).

Адзначым далейшае развіццё *супастаўляльнага сінтаксісу* (гл. Конюшкевич 1990; Прохорова 1991; Конюшкевич, Корчиц, Лещенко 1994; Чумак 1997; Михайлова 1998; Бордович, Гируцкий, Чернышева 1999 і інш.), *функцыянальнага сінтаксісу* (гл. Конюшкевич 1990; Шуба 1993; Рабчинская 1994; Киклевич 1999), *арэальнага сінтаксісу* (гл. Прохорова 1991, 1991 [а], 1998, 1999; Прохарава 1993), *стылістычнага сінтаксісу* (гл. Асновы 1992; Абабурка 1994; Цікоцкі 1995). *Семантычны сінтаксіс* прадстаўлены паланістычным даследаваннем Т. Вернікоўскай (гл. Верниковская 1998). У русістыцы ў гэты час абаронена *лінгваметадычная дысертацыя* Ф.М. Літвінкі *па тэорыі і практыцы навучання сінтаксісу ўскладненага сказа* (гл. Литвинко 1996). Адзначым таксама з'яўленне **новага аспекту сінтаксічных даследаванняў у беларусістыцы** – ***культуралагічнага сінтаксісу***, асноўнымі прадстаўнікамі якога з'яўляюцца С.М. Прохарава і Л.М. Чумак (гл. Прохорова 1999 [а]; Чумак 1994, 1997, 1997 [а]; Михайлова 1998).

У **2000-я гг.** як аб'екты даследавання, так і аспекты вывучэння пэўных сінтаксічных адзінак традыцыйныя для беларускай сінтакталогіі. Так, 12 прац прысвечана *сінтаксісу (простага) сказа* (гл. Рудэнка 2000; Паўлоўская 2001; Рамза 2002; Маршэўская 2003; Антанюк 2004; Никитевич 2004, 2005 і інш.), восем – *сінтаксісу словазлучэння* (гл. Свірыдзенка 2001; Леановіч 2002; Садоўская 2002; 2003; Антанюк 2003; Міхневіч, Рамза 2005 і інш.), восем – *сінтаксісу ССЦ/ЗФА* і *тэксту* (гл. Курбека 2000; Супрун 2001; Цікоцкі 2002; Шандроха 2002; Яўдошына 2002; Ячмянёва 2002; Лаўрэль 2004; Ревуцкий 2006), шэсць – *сінтаксісу складанага сказа* (гл. Крук 2000; Рапацэвіч 2000; Шахаб 2000; Петыш 2002; Савіцкая 2003; Протчанка 2004). Агульная колькасць абарон – 15: 2 доктарскія і 13 (самая вялікая колькасць за ўсе перыяды) кандыдацкіх дысертацый.

Прадстаўлены ўсе аспекты вывучэння сінтаксісу беларускай мовы, станаўленне якіх адбылося ў папярэднія перыяды: *фармальны* (гл. Рагаўцоў 2000, 2001; Лепешаў 2002; Паўлоўская 2001; Плотнікаў, Антанюк 2003; Чалюк 2004; Сінтаксіс 2005; Плотнікаў 2005; Яўневіч, Сцяцко 2006; Маршэўская 2008; Кароткая граматыка 2009 і інш.), *гістарычны* (гл. Рапацэвіч 2000), *семантычны* (гл. Важнік 2002, 2008; Kiklewicz, Korytkowska, Mazurkiewicz-Sułkowska, Zatorska, Ramza 2010), *функцыянальны* (гл. Kiklewicz 2004; Канюшкевіч 2008–2010 [а]), *супастаўляльны* (гл. Важнік 2002, 2008; Саковіч 2005), *стылістычны* (гл. Сцяцко 2002; Цікоцкі 2002; Слоўка за слоўкам 2006), *арэальны* (гл. Прохорова 2002; Полетаева 2003), *культуралагічны* (гл. Чумак 2003), *лінгваметадычны* (гл. Шахаб 2000; Свірыдзенка 2001; Протчанка 2004). Адзначым таксама з'яўленне **першай працы па *экспрэсіўным сінтаксісе*** Н.Э. Шандрохі (гл. Шандроха 2002).

*Стылістычны сінтаксіс* (або *сінтаксічная стылістыка*), да распрацоўкі якога далучыліся вядомыя беларускія стылісты і сінтаксісты М. Абабурка, Л. Бурак, А. Каўрус, А. Міхневіч, П. Сцяцко, К. Цвірка, М. Цікоцкі і інш., за апошняе дзесяцігоддзе, дзякуючы наватарскім ідэям А.Я. Міхневіча, трансфармаваўся ў *арталагічны сінтаксіс*, у рэчышчы якога разглядаюцца памылкі, недакладнасці, адступленні ад літаратурных норм (у тым ліку і сінтаксічных), што назіраюцца ў паўсядзённай маўленчай практыцы беларусаў (гл. Слоўка за слоўкам 2006).

У беларускай русістыцы і славістыцы маюць месца працы, без якіх агляд сучаснай сінтаксічнай тэорыі быў бы няпоўны. Так, абаронены дзве доктарскія дысертацыі па *сінтаксісе тэксту* (гл. Задворная 2000, 2001; Кудреватых 2001, 2001 [а]), кандыдацкая дысертацыя па *аналітычных прэдыкатах у польскай мове* (гл. Пальянова 2008). Не засталіся незаўважанымі апублікаваныя ў 2000-я гг. манаграфіі: даследаванне В.У. Мартынава, прысвечанае распрацоўцы *тэорыі ўніверсальнага семантычнага кода* (гл. Мартынов 2001), праца Б.Ю. Нормана па *камунікатыўным* і *прагматычным сінтаксісе* (гл. Норман 2002), манаграфія Т.В. Вернікоўскай, у якой апісваецца *семантычная структура простага польскага сказа* (гл. Верниковская 2001), манаграфія В.К. Церлюкевіча, прысвечаная вывучэнню *дыферэнцыяльных прымет словазлучэння* і *простага сказа* (гл. Церлюкевич 2004).

Асобага вітання заслугоўвае фундаментальная праца М.І. Канюшкевіч «Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання», выдадзеная ў трох частках у 2008–2010 гг. Вядомая беларуская даследчыца, стваральніца гродзенскай школы *функцыянальнага сінтаксісу*, працягвае «прыназоўнікавую» справу свайго Настаўніка праф. П.П. Шубы. Па дадзеных М.І. Канюшкевіч, у сучаснай беларускай мове больш за сем тысяч (!) прыназоўнікаў і іх аналагаў (гл. Канюшкевіч 2008, 21). Да параўнання: П.П. Шуба ў сваім сінтаксічным слоўніку (гл. Шуба 1993) апісвае толькі 507 адзінак.

Адзначым спробу *кантрастыўнага лексікаграфічнага апісання валентнасці* асобных беларускіх дзеясловаў, распачатую А.М. Рудэнка, Н.В. Івашынай, Н.В. Яўмен (гл. Руденко, Ивашина, Яумен 2004). Практычная частка гэтай шматмоўнай працы ўяўляе сабой *сінтаксічны слоўнік* беларускіх, польскіх, рускіх і чэшскіх дзеясловаў. Слоўнік складаецца з дзвюх частак: першая ёсць класічны *слоўнік кіравання*; другая – спроба *семантыка-сінтаксічнага супастаўлення* асобных славянскіх дзеясловаў «у фармаце» валентнаснага слоўніка (гл. Руденко, Ивашина, Яумен 2004, 51–71, 102–120).

Вынікам яшчэ аднаго міжнароднага праекта па супастаўляльным сінтаксісе сучасных славянскіх моў «Składnia porównawcza języków słowiańskich drugiej połowy XX wieku» (кіраўнік праекта – праф. С. Кароляк) стала калектыўная манаграфія «Podstawowe struktury zdaniowe współczesnych języków słowiańskich: białoruski, bułgarski, polski» (гл. Kiklewicz, Korytkowska, Mazurkiewicz-Sułkowska, Zatorska, Ramza 2010). Практычная частка манаграфіі ўяўляе сабой шматмоўны *семантыка-сінтаксічны валентнасны слоўнік*, у якім, акрамя добра распрацаванага *глыбіннага сінтаксісу*, падрабязна апісаны таксама найбольш істотныя з’явы *сінтаксісу паверхневага*: адрозная рэалізацыя на фармальна-граматычным узроўні адных і тых жа прапазіцыйных структур у розных мовах.

2000-я гг. характарызуюцца павелічэннем колькасці дапаможнікаў па сінтаксісе і пунктуацыі перш за ўсё для школьнікаў і абітурыентаў. Выдадзены новыя па тэматыцы і па тэарэтыка-метадалагічных канцэпцыях падручнікі для ВНУ, сярод якіх вылучаюцца працы прызнаных беларускіх лінгвістаў: Л.А. Антанюк (гл. Антанюк 2003, 2004), Б.А. Плотнікава (гл. Плотнікаў 2005; Плотнікаў, Антанюк 2003), А.Я. Міхневіча (гл. Міхневіч, Рамза 2005; Слоўка за слоўкам 2006), В.У. Протчанкі (гл. Протчанка 2004), І.Я. Лепешава (гл. Лепешаў 2002), П.У. Сцяцко і М.С. Яўневіча (гл. Сцяцко 2002; Яўневіч, Сцяцко 2006), М.Я. Цікоцкага (гл. Цікоцкі 2002), В.І. Рагаўцова (гл. Рагаўцоў 2000, 2001) і інш. Адзначым таксама з’яўленне *вучэбна-метадычных комплексаў* па сінтаксісе сучаснай беларускай мовы. У гэтым плане на агульным фоне вылучаюцца падручнікі для студэнтаў спецыяльнасці «Беларуская філалогія» дацэнта БДУ Т.Р. Рамзы (гл. Рамза 2002, 2003, 2006, 2008).

